Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар БДУКМ
____________ А. А. Корбут
«____» ___________2016 г.
Рэгістрацыйны № ВД- ___/вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ВЫВУЧЭННЕ ПЕДАГАГІЧНАГА РЭПЕРТУАРУ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-17 03 01 Мастацтва эстрады (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці*
*1-17 03 01-01 Мастацтва эстрады*
*(інструментальная музыка)*

Мінск
БДУКМ
2016

**СКЛАДАЛЬНІК**

*Т. У. Дзейко,* дацэнт кафедры мастацтва эстрады ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*І. Ф. Чарняўская,* дацэнт кафедры музычна-педагагічнай адукацыі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка», кандыдат педагагічных навук, дацэнт;

*В. У. Мазанік,* загадчык кафедры народна-інструментальнай творчасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* мастацтва эстрады ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 3 ад 12.10.2015 г. );

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 2 ад 21.12.2015 г.)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: Т. У. Дзейко

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Вывучэнне педагагічнага рэпертуару» накіравана на падрыхтоўку высокапрафесійных музыкантаў, якія могуць на сучасным узроўні ажыццяўляць педагагічную дзейнасць. Дадзеная вучэбная дысцыпліна цесна ўзаемазвязана з такімі вучэбнымі дысцыплінамі, як «Спецінструмент», «Прафесійная педагогіка і методыка выкладання спецдысцыплін». Праграма прадугледжвае сістэматычнае і паслядоўнае засваенне асноў методыка-тэарэтычных ведаў і практычных уменняў падбору рэпертуару, а таксама паглыбленне і замацаванне навыкаў і ведаў, атрыманых у працэсе вывучэння іншых навучальных дысцыплін спецыяльнасці.

*Мэтай* вучэбнай дысцыпліны «Вывучэнне педагагічнага рэпертуару» з'яўляецца набыццё студэнтамі ведаў і ўменняў у сферы педагагічнай дзейнасці, неабходных для самастойнай прафесійнай працы ў якасці выкладчыка.

*Задачы:*

– падрыхтоўка студэнта да будучай педагагічнай дзейнасці;

– вывучэнне педагагічнага рэпертуару для наступнага яго выкарыстання ў прафесійнай дзейнасці;

– развіццё самастойнасці пры падборы музычнага рэпертуару і інтэрпрэтацыі музычных твораў;

– сістэматызацыя і пашырэнне тэарэтычных і практычных ведаў у галіне музычнага мастацтва эстрады;

– фарміраванне навыкаў самастойнай працы, навукова-педагагічнага пошуку і імкнення да самаадукацыі.

Пастаўленыя задачы ствараюць спрыяльныя ўмовы для развіцця педагагічнай творчасці, поўнага раскрыцця музычных ведаў, развіцця мэтанакіраванасці, пэўнага мастацкага густу і дасканалага валодання методыкай падбору педагагічнага рэпертуару.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Вывучэнне педагагічнага рэпертуару» студэнты павінны *ўмець:*

– ажыццяўляць прынцыпы складання і падбору педагагічнага рэпертуару ДМШ;

– выконваць прынцып планавання заняткаў з навучэнцам;

– складаць музычную праграму для розных узростаў навучэнцаў;

– весці дзённік навучэнца, арганізоўваць вучэбны працэс;

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

– выкарыстоўваць метадычныя зборнікі музычных твораў і карыстацца метадычнымі крыніцамі;

– арыентавацца ў стылях і напрамках;

– самастойна працаваць з нотным матэрыялам;

*ведаць:*

– асноўныя катэгорыі прафесійнай педагогікі, заканамернасці і прынцыпы музычнага выхавання, адукацыі і развіцця асобы;

– этапы гісторыі развіцця музычнага выхавання і адукацыі;

– прынцып планавання ўрока з навучэнцам;

– прынцып складання музычных праграм для навучэнца;

– методыку работы над музычным творам;

– жанры, стылі;

– праграмныя патрабаванні да педагагічнага рэпертуару;

*валодаць*:

– сучаснымі метадамі, сродкамі і тэхналогіямі музычнага навучання на пачатковай ступені музычнай адукацыі;

– навыкамі вывучэння перадавога педагагічнага вопыту і творчага выкарыстання яго ў сваёй педагагічнай дзейнасці;

– методыкай выкладання спецыяльных дысцыплін у прафесійных і агульных установах музычнай адукацыі.

Важнейшымі ўмовамі паспяховага засваення вучэбнай дысцыпліны з'яўляецца самастойная работа студэнтаў, індывідуальнае самавыхаванне, пашырэнне музычнага і педагагічнага кругагляду. Студэнтам прапануецца акцэнтаваць увагу на падрабязным самастойным авалоданні асноўным матэрыялам і абавязковым выкананні вучэбных праграм з выкарыстаннем такіх тэхнічных магчымасцей, як відэа- і аўдыяінфармацыя. Пры выкладанні дадзенай дысцыпліны выкарыстоўваюцца наступныя тэхналогіі навучання: інфармацыйныя, эўрыстычныя, эмацыянальна-мастацкія, асабова-арыентацыйныя, творчыя.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Вывучэнне педагагічнага рэпертуару» адведзена 80 гадзін, з якіх 44 гадзіны – аўдыторныя заняткі (30 гадзін – лекцыі, 14 гадзін – семінары). Рэкамендаваная форма кантролю ведаў студэнтаў – залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | усяго | лекцыі | практ. зан. |
| ***Уводзіны*** | 1 | 1 | |
| *Тэма 1.* Метадычныя прынцыпы сучаснай музычнай педагогікі | 3 | 3 | |
| *Тэма 2.* Рэпертуар як аснова выканальніцкай і педагагічнай дзейнасці | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 3.* Складанне педагагічнага рэпертуару для ДМШ | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 4.* Інструктыўны матэрыял | 2 | | 2 |
| *Тэма 5.* Жанры і стылі | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 6.* Вывучэнне твораў малой формы | 4 | 4 | |
| *Тэма 7.* Вывучэнне твораў буйной формы | 2 | | 2 |
| *Тэма 8.* Музычны сінтаксіс | 4 | 4 | |
| *Тэма 9.* Планаванне заняткаў з навучэнцамі | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 10.* Патрабаванні да музычнага твора | 4 | 4 | |
| *Тэма 11.* Складанне музычных праграм, індывідуальнага плана, крытэрыі адзнакі | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 12.* Выхаваўчая, канцэртная, пазакласная работа | 4 | 4 | |
| **Разам…** | **44** | **30** | **14** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## *Уводзіны*

Мэтазгоднасць і практычная значнасць вучэбнай дысцыпліны «Вывучэнне педагагічнага рэпертуару». «Вывучэнне педагагічнага рэпертуару» як вучэбная дысцыпліна. Узаемасувязь з іншымі дысцыплінамі спецыяльнага цыкла. Сутнасць, мэты і задачы вучэбнай дысцыпліны. Змест вучэбнай дысцыпліны і асноўныя патрабаванні да яго вывучэння.

### *Тэма 1. Метадычныя прынцыпы сучаснай музычнай педагогікі*

Асноўныя прынцыпы, метады і прыёмы выкладання спецдысцыплін. Методыка аналізу ўрока, канцэртнага выступлення. Практычны паказ работы пры вырашэнні з вучнем канкрэтных мастацкіх і тэхнічных задач. Аналіз метадычнай літаратуры, вучэбных дапаможнікаў.

Накапленне педагагічнага вопыту на базе дасягненняў папярэдніх пакаленняў. Школы (методыка ігры на інструменце), музычныя стылі. Вядомыя педагогі свету і нашай краіны. Роля паказу як прынцыпу нагляднасці ў сістэме навучання. Паказ як метад навучання. Прынцып нагляднасці ў сістэме навучання. Разнастайнасць паказу.

### *Тэма 2. Рэпертуар як аснова выканальніцкай і педагагічнай дзейнасці*

Роля вучэбнага рэпертуару ў вырашэнні педагагічных задач. Агульныя метадычныя прынцыпы адбору і сістэматызацыі вучэбнага рэпертуару (эпоха, аўтар, жанр, стыль, асаблівасці выканання, ступені цяжкасці). Неабходнасць уключэння ў рэпертуар навучэнца твораў розных кампазітараў, розных па змесце, форме, стылі.

Састаўленне індывідуальных планаў навучэнцаў ДМШ. Развіццё творчых задаткаў, ініцыятыўнасці, самастойнасці музычнага мыслення студэнтаў. Арганізацыя самастойнай работы.

### *Тэма 3. Складанне педагагічнага рэпертуару для ДМШ*

Прынцыпы дыдактыкі як аснова складання педагагічнага рэпертуару і яго сістэматызацыі. Галоўныя прынцыпы складання педагагічнага рэпертуару: ад простага да складанага,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спалучальнасць традыцыйнага і наватарскага, пазнавальны падыход да музыкі, педагагічная мэтазгоднасць, тэхнічнае развіццё, эмацыянальнае, перспектыва развіцця навучэнца.

Узаемасувязь падбору рэпертуару і фізічнага развіцця навучэнца, яго зацікаўленасці і адносін да заняткаў, інструмента і г. д. Чытанне нот з ліста. Музычная памяць, мабільная аплікатура.

*Тэма 4. Інструктыўны матэрыял*

Яднанне музычна-мастацкага і тэхнічнага развіцця навучэнца як галоўны прынцып інструктыўнага матэрыялу. Практыкаванні, гамы, эцюды. Значэнне і роля работы над імі. Практыкаванні, іх прызначэнне: на розныя віды тэхнікі і тэхнічныя прыёмы. Асэнсаваная праца над дасягненнем выразнасці тэхнікі гуказдабывання, маторыкі пальцаў, штрыхоў.

Гамы. Метад вывучэння: асноўны від, храматычная гама, арпеджыа, двайныя ноты, штрыхі (дэташэ, легата, стаката, мартле, камбінаваныя штрыхі і інш.). Спецыфіка выканання штрыхоў у акадэмічнай музыцы. Штрыхавая культура і асаблівасці выканання ў розных стылях акадэмічнай музыкі. Прынцыпы мастацкага выкарыстоўвання розных відаў штрыхоў. Рытмічныя разнастайныя ўзоры (дуоль, трыёль, квартоль, секстоль, пункцірны рытм). Азнаямленне са стандартнымі рытмічнымі фігурацыямі, узаемасувязь рытмічнай фразіроўкі і штрыха. Авалоданне рознымі аплікатурамі ў гамах.

Эцюды. Азначэнне асноўных метадычных задач эцюдаў: развіццё дробнай і буйной тэхнікі, вывучэнне штрыхоў і манеры выканання ў розных стылях, азнаямленне з рознымі тыпамі выкладу і злучэння акордаў, валоданне дынамікай (ад PP да FF).

Пры вывучэнні тэмы студэнтам неабходна азнаёміцца з 15–20 практыкаваннямі і эцюдамі на розныя віды тэхнікі для навучэнцаў розных класаў.

*Тэма 5. Жанры і стылі*

Асноўныя жанры: песня, танец, марш. Іх рытмічныя асаблівасці, якія вызначаюць іх прыналежнасць да жанру.

Стылі. Азнаямленне з гісторыяй узнікнення музычных стыляў і іх узаемасувязь з мастацкімі стылямі. Стылі: барока (кампазітары Д. Тарціні, Б. Кампаньёлі, Г. Гэндель, І. Бах,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

А. Вівальдзі і інш.), класічны (І. Гайдн, В. Моцарт, Л. Бетховен, Ф. Шуберт, П. Чайкоўскі, С. Рахманінаў, С. Пракоф'еў і інш.), рамантычны (Ф. Шапэн, Э. Грыг, Р. Шуберт, Я. Сібеліус і інш.), мадэрн (Д. Міё, Р. Штраус, А. Веберн, І Стравінскі, Д. Шастаковіч, Б. Бартак, К Шыманоўскі, С. Барбер, Э. Віла-Лобас і інш.).

Нацыянальныя кампазітарскія стылі і іх асаблівасці: артыкуляцыя гукаў і рытмічных узораў, гуказдабыванне, штрыхі, дынаміка, агогіка.

*Тэма 6. Вывучэнне твораў малой формы*

Значэнне вывучэння малой формы (п'есы, мініяцюры) у навучанні. Павольная п'еса (кантылена) з яскрава выяўленай мелодыяй. Віртуозная п'еса як сродак развіцця тэхнікі, каардынацыі рук, хуткага мыслення, кантролю над усім дзеяннем.

Вывучэнне спецыфічных цяжкасцей твораў малой формы (тэмп, рытм, метр, лад, мелодыя, гармонія, дынаміка, тэмбр, фактура, цэзура і інш.). Характарыстыка зборнікаў п'ес. Чытанне нот з ліста. Метадычны і выканальніцкі аналіз.

Пры вывучэнні тэмы студэнтам неабходна азнаёміцца з 40–50 п'есамі розных класаў ДМШ.

*Тэма 7. Вывучэнне твораў буйной формы*

Паняцце буйной формы – канцэрт, старадаўняя саната, саната, санаціна, варыяцыі. Патрабаванні для вывучэння твораў буйной формы: агульны папярэдні агляд, аналіз кожнай з асноўных частак, аналіз частак у цэлым, вызначэнне кульмінацыі, адзінства і разнастайнасці тэмпаў, вобразаў, характару музыкі, дынамікі, нюансаў, рытмічных малюнкаў, захаванне артыкуляцыі стылю на працягу ўсяго твора буйной формы, выхаванне вытрыманасці і трываласці пры выкананні.

Пры вывучэнні тэмы студэнтам неабходна азнаёміцца з 12–14 творамі буйной формы розных класаў ДМШ.

*Тэма 8. Музычны сінтаксіс*

Мелодыя. Класіфікацыя тыпаў мелодыі і інтанацый. Асноўныя лады, простыя і складаныя метрарытмічныя малюнкі. Інтэрвалы, арпеджыа, акорды. Сродкі музычнай выразнасці. Музычнае інтанаванне, дынаміка, штрыхі, фразіроўка, агогіка, тэмпарытм.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 9. Планаванне заняткаў з навучэнцамі*

Методыка вызначэння музычных здольнасцей і крэатыўнасці навучэнца. Дыферэнцыраваны падыход у ракурсе псіхафізіялагічных, пастановачных, адукацыйных, творчых здольнасцей і агульнага развіцця навучэнца. Педагагічная мэтазгоднасць і падпарадкаванасць рэпертуару педагагічным задачам на ўсіх узроўнях выкладання спецдысцыпліны.

*Тэма 10. Патрабаванні да музычнага твора*

Крытэрыі патрабаванняў да педагагічнага рэпертуару: прадметна-вобразны (С. Пракоф'еў «Пеця і воўк»); музычна-жанравыя і музычна-стылявыя (танец, песня, марш); музычна-выразныя (форма, стыль, музычны сінтаксіс, мелодыя); інтанацыйныя і эмацыянальна-экспрэсіўныя (Сен-Санс «Лебедзь», А. Дворжак «Мелодыя», П. Чайкоўскі «Думка», Р. Шуман «Карнавал», М. Мусаргскі «Малюнкі з выставы» і інш.). Культура паводзін пры выкананні музычнага твора.

*Тэма 11. Складанне музычных праграм,*
*індывідуальнага плана, крытэрыі адзнакі*

Дыферэнцыраваны падыход да складання музычных праграм для розных мэт: адкрыты урок, акадэмічны канцэрт, экзамен, выпускны экзамен, канцэрт для бацькоў, конкурс. Складанне і запаўненне індывідуальнага плана навучэнца, вядзенне дзённіка навучэнца. Крытэрыі адзнакі ведаў і ўменняў навучэнца.

*Тэма 12. Выхаваўчая, канцэртная, пазакласная работа*

Узаемаадносіны выкладчыка і навучэнца, выкладчыка і бацькоў. Педагагічная інтуіцыя, індывідуальны падыход да кожнага вучня. Выхаванне самастойнай працы ў навучэнца. Роля сумесных выступленняў (выкладчык і навучэнец) у канцэртах перад бацькамі. Наведванне канцэртаў, выстаў, творчых імпрэз. Сумеснае праслухоўванне ўзораў сусветных выканаўцаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Асафьев, Б.* Избранные статьи о музыкальном просвещении и образовании / Б. Асафьев. – Л. : Музыка, 1973. – 232 с.

2. *Брейтбург, Й.* Педагог и исполнитель / Й. Брейтбург. – М. : Музыка, 1966. – 190 с.

3. *Вишнякова, Н.* Развитие личности в процессе музыкального творчества : пособие для учителей / Н. Вишнякова. – Минск : Белорус. НИИ образования Беларуси, 1992. – 79 с.

4. *Верхолаз, Р.* Вопросы методики чтения нот с листа / Р. Верхолаз. – М. : Музыка, 1969. – 98 с.

5. *Либерман, Е.* Творческая работа с авторским текстом / Е. Либерман. – М. : Музыка, 1988. – 240 с.

6. *Мартинсен, К.* Методика индивидуального преподавания игры на фортепиано / К. Мартинсен. – М. : Музыка, 1977. – 128 с.

7. *Мильштейн, Я.* Вопросы истории и теории исполнительства : сб. ст. / Я. Мильштейн. – М. : Сов. композитор, 1983. – 266 с.

8. *Цыпин, Г.* Музыкант и его работа: Проблемы психологии творчества / Г. Цыпин. – М. : Музыка, 1988. – Вып. 1. – С. 43–68.

9. *Ямпольский, А.* Метод работы с учениками / А. Ямпольский // Вопросы скрипичного исполнительства и педагогики : сб. ст. / сост. С. Сапожников. – М. : Музыка, 1968. – С. 7–59.

*Дадатковая*

1. *Алексеев, А.* Творчество музыканта-исполнителя / А. Алексеев. – М. : Музыка, 1991. – 104 с.

2. *Блок, В.* Метод творческой работы С. Прокофьева / В. Блок. – М. : Музыка, 1979. – 600 с.

3. *Зенкин, К.* Фортепианная миниатюра и пути музыкального романтизма / К. Зенкин. – М. : Музыка, 1997. – 286 с.

4. *Иванов, К.* Волшебство музыки / К. Иванов. – М. : Музыка, 1983. – 57 с.

5. *Коган, Г.* У врат мастерства / Г. Коган. – М. : Музыка, 1969. – 130 с.

6. *Курбатов, М.* Несколько слов о художественном исполнении / М. Курбатов. – М. : Музыка, 1999. – 74 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*7. Лобанова, М.* Западноевропейское барокко: проблемы эстетики и поэтики / М. Лобанова. – Л. : Музыка, 1980. – 164 с.
*8.* Музыкальный словарь Гроува : пер. с. англ. – М. : Практика, 2001. – 1095 с.
*9. Нейгауз, Г.* Об искусстве фортепианной игры / Г. Нейгауз. – М. : Музыка, 1988. – 296 с.
*10. Ойстрах, Д.* Воспоминания. Статьи. Интервью. Письма / сост. В. Григорьев. – М. : Музыка, 1978. – 310 с.
*11.* Современный словарь по педагогике / сост. Е. С. Рапцевич. – Минск : Совр. слово, 2001. – 928 с.
*12. Цуккерман, В.* Анализ музыкальных произведений (Вариационная форма) / В. Цуккерман. – М. : Музыка, 1974. – 127 с.
*13. Асафьев, Б.* Музыкальная форма как процесс / Б. Асафьев. – Л. : Музыка, 1971. – 156 с.
*14. Баренбойм, Л.* Вопросы фортепианной педагогики и исполнительства / Л. Баренбойм. – Л. : Музыка, 1979. – 284 с.
*15. Беккер, Х.* Техника и искусство игры на виолончели / Х. Беккер и Д. Ринар. – М. : Музыка, 1982. – 340 с.
*16. Беленький, Б.* Работа над произведениями крупной формы в ДМШ. Вопросы скрипичного исполнительства и педагогики / Б. Беленький. – М. : Музыка, 1968. – 230 с.
*17. Рабинович, Д.* Исполнитель и стиль / Д. Рабинович. – М. : Музыка, 1979. – Вып. 1. – 320 с.
*18. Теплов, Б.* Психология музыкальных способностей / Б. Теплов. – АПН РСФСР. – Л. ; М., 1947. – 345 с.
*19. Гарбузов, Н.* Зонная природа звуковысотного слуха / Н. Гарбузов // Н. А. Гарбузов – Музыкант, исследователь, педагог / под. ред. Ю. Н. Рагса. – М. : Музыка, 1980. – С. 80–146.
*20. Григорьев, В.* Методические взгляды Ю. И. Янкелевича / В. Григорьев. – М. : Музыка, 1982. – 270 с.
*21. Крамер, Д.* Джазовые этюды / Д. Крамер. – М. : Музыка, 1985. – 50 с.
*22. Кунин, Э.* Секреты ритмики в джазе, рок- и поп-музыке / Э. Кунин. – М. : Музыка, 1997. – 40 с.
*23. Володин, А.* Психологические аспекты восприятия музыкальных звуков / А. Володин. – М. : Музыка, 1969. – 115 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў*

Пры складанні заданняў самастойнай работы па вучэбнай дысцыпліне «Вывучэнне педагагічнага рэпертуару» неабходна прадугледзець узрастанне іх складанасці: ад заданняў, якія фарміруюць дастатковыя веды па вывучаным вучэбным матэрыяле на ўзроўні пазнавання, да заданняў, якія фарміруюць кампетэнцыі на ўзроўні ўзнаўлення, і далей да заданняў, якія фарміруюць кампетэнцыі на ўзроўні ўжывання атрыманых ведаў.

Пры выкананні самастойнай работы па вучэбнай дысцыпліне «Вывучэнне педагагічнага рэпертуару» студэнт павінен звярнуць увагу на:

– самастойныя заняткі на інструменце;

– праслухоўванне аўдыязапісаў майстроў акадэмічнай і сучаснай музыкі;

– аналіз хрэстаматый, зборнікаў музычных твораў для ДМШ;

– прагляд відэаматэрыялаў адкрытых заняткаў знакамітых педагогаў;

– наведванне майстар-класаў вядучых педагогаў краіны і іншых краін;

– вывучэнне тэарэтычнай часткі спадчыны знакамітых педагогаў.

## *Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў*

Для кантролю і самакантролю ведаў студэнтаў выкарыстоўваецца наступны дыягнастычны інструментарый:

– тэставыя заданні;

– практычныя заданні;

– заданні для самастойнай работы;

– кантроль самастойнай працы;

– вуснае апытанне ў час заняткаў;

– дэманстраванне ведаў студэнта ў адкрытым уроку;

– залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў***

***10 балаў*** – адказ на вельмі высокім узроўні. Студэнт дэманструе яскравы адказ з паказам самастойна вывучанага матэрыялу па педагагічным рэпертуары. Самастойны творчы падыход да працы над музычна-выканальніцкім аналізам, метадычным разборам твораў, складання індывідуальнага плана навучэнца.

***9 балаў*** – адказ на высокім узроўні. Студэнт валодае глыбокімі сістэмнымі ведамі педагагічнага рэпертуару і патрабаванняў да яго. Высновы робіць самастойна. Творчы і аналітычны падыход да працы над музычна-выканальніцкім аналізам, метадычным разборам твораў, выканання практычных заданняў.

***8 балаў*** – адказ на дастатковым высокім узроўні. Студэнт мае трывалыя, глыбокія веды педагагічнага рэпертуару і праграмных патрабаванняў да яго. Наяўнасць адзінкавых памылак у працы над музычна-выканальніцкім аналізам, метадычным разборам твораў, недахопы ў выкананні практычных заданняў.

***7 балаў*** – адказ на добрым прафесійным узроўні. Студэнт поўна, трывала ведае педагагічны рэпертуар і патрабаванні да яго. Наяўнасць неістотных памылак у працы над музычна-выканальніцкім аналізам, метадычным разборам твораў, недасканаласць у практычным заданні.

***6 балаў*** – адказ на добрым узроўні. Студэнт ведае педагагічны рэпертуар няпоўна. Наяўнасць неістотных памылак у працы над музычным выканальніцкім аналізам, метадычным разборам твораў, памылкі ў практычным заданні, фрагментарная самастойная работа.

***5 балаў*** – адказ на невысокім прафесійным узроўні. Студэнт прадэманстраваў веданне агульных паняццяў, але мае несістэматызаваныя веды. Наяўнасць неістотных памылак у працы над музычна-выканальніцкім аналізам, метадычным разборам твораў, недасканаласць у практычным заданні.

***4 балы*** – адказ на здавальняючым узроўні. Веды студэнта няпоўныя, дапушчаны сур'ёзныя памылкі ў адказе. Наяўнасць істотных памылак у працы над музычна-выканальніцкім аналізам, метадычным разборам твораў, сур'ёзныя памылкі ў практычным заданні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***3 балы*** – адказ на нездавальняючым узроўні з істотнымі памылкамі. Студэнт мае прыблізныя, агульныя ўяўленні аб педагагічным рэпертуары. Пры адказе дапускае шмат прынцыповых памылак у працы над музычна-выканальніцкім аналізам, метадычным разборам твораў, не поўнасцю выканана практычнае заданне.

***2 балы*** – адказ на нездавальняючым узроўні. Частковыя, адрывістыя веды педагагічнага рэпертуару. Наяўнасць шматлікіх істотных памылак у працы над музычна-выканальніцкім аналізам, метадычным разборам твораў, невыкананне практычнага задання.

***1 бал*** – адмова ад адказу на экзамене.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ВЫВУЧЭННЕ ПЕДАГАГІЧНАГА РЭПЕРТУАРУ**

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-17 03 01 Мастацтва эстрады (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці*
*1-17 03 01-01 Мастацтва эстрады*
*(інструментальная музыка)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2016. Фармат 60x84 $^1/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 0,87. Ул.-выд. арк. 0,53. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ